публіцыстычным стылі. У «Паэтычным слоўніку» В. П. Рагойшы адзначаецца, што «метафара – ужыванне слова ці выразу ў пераносным значэнні праз супастаўленне пэўнай з'явы ці прадмета з іншай з'явай ці прадметам на аснове агульных для іх адзнак і ўласцівасцей» [1, с. 106].

На прыкладзе публіцыстыкі С. Грахоўскага разгледзім метафарычную сістэму яго твораў.

Існуе некалькі класіфікацый метафары, якія разглядаюць троп з розных бакоў. Так, па функцыі ў мове метафары падзяляюцца на агульнамоўныя, або паэтычныя («А ў Юркавым пакойчыку **жыла паэзія**» [2, с. 36]) і індывідуальна-аўтарскія («**Жыццё** само **адказала** на гэтыя пытанні»[2, с. 16]).

Метафары класіфікуюцца і паводле граматычнай характарыстыкі. Найбольш часта сустракаюцца вербальныя, або дзеяслоўныя метафары: «Ніхто не хацеў паверыць, што **ляціць смерць, пагібель і гора** на мірны і зялёны горад» [2, с. 10].

Метафары, у якіх метафарызаваным кампанентам выступае назоўнік, называюцца субстантыўнымі. Яны дзеляцца на генетыўныя (у якіх адзін кампанент стаіць у назоўным склоне, а другі ўжываецца ў родным): «Над горадам стаяў **водар вясны**» [2, с. 22] і ўласна субстантыўныя (з іншымі спалучэннямі назоўнікаў): «**Тэатр-юбіляр** быў узнагароджаны Ганароваю граматаю…» [2, с. 57].

Ад'ектыўнай з'яўляецца метафара, дзе ў якасці метафарызаванага слова выступае прыметнік: «**Кідкая дабрата, даступнасць, ветлівая добразычлівасць** вабілі да сябе, нібы запрашалі да шчырай адкрытасці» [2, с. 29].

Існуюць і адвербіяльныя метафары, метафарызаваным кампанентам якіх з'яўляецца прыслоўе: «**Горача абняла** і пачала распытваць, якая патрэба прывяла сюды» [2, с. 25].

Увасабленне, або персаніфікацыя, з'яўляецца пашыранай разнавіднасцю метафары: «Па іх сёння **журацца і плачуць** тваe **бярозы і ліпы**, з тваіх глыбінь **прабіўся** незгасальны **агонь** сэрцаў герояў апошняй вайны» [2, с. 10].

Такім чынам, метафара як сродак выяўленчай выразнасці адыгрывае значную ролю ў публіцыстычным дыскурсе. Яна даволі часта сустракаецца ў публіцыстычных творах з мэтай стварэння патрэбнага настрою, эмацыйнага ўздзеяння на чытача. Сярод разгледжаных намі твораў С. Грахоўскага пераважаюць агульнамоўныя метафары. Што да часцінамоўнай прыналежнасці, то ўсе віды метафары прадстаўлены раўнамерна. Сустракаецца ў творах і персаніфікацыя, якая надае ім большую выразнасць і займальнасць.

**Літаратура**

1 Рагойша, В. П. Паэтычны слоўнік / В. П. Рагойша. – Мінск : Выш. школа, 1979. – 320 с.

2 Грахоўскі, С. Так і было : Артыкулы. Успаміны. Эсэ / С. Грахоўскі. – Мінск : Маст. літ., 1986. – 271 с.

***В. А. Барадзін***
*Навук. кір.* ***Т. А. Фіцнер,***
*канд. філал. навук, дацэнт*

## М. ГАРЭЦКІ ЯК ПІСЬМЕННІК «СТРАЧАНАГА ПАКАЛЕННЯ»

Паняцце «страчанае пакаленне» належыць Гертрудзе Стайн, прадстаўніцы амерыканскага мадэрнізму, якая жыла ў Парыжы. Тэрмін гэты характарызуе творцаў, маладосць якіх была абпалена вайной і прайшла ў акопах. Сярод самых знакамітых прадстаўнікоў «страчанага пакалення» варта адзначыць такіх, як Э. Хэмінгуэй, С. Фіцджэральд, Г. Стайн, Т. Эліат, А. Барбюс і Э. М. Рэмарк. Літаратурны стыль іх вельмі індывідуальны, а агульныя рысы прасочваюцца як у змесце, так і ў форме.

Беларуская літаратура не такая прадстаўнічая ў гэтым плане. Спроба асэнсаваць Першую сусветную вайну была зроблена Я. Купалам (вершы «Песні вайны», «1914-ы»,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

«Вясна 1915»), З. Бядулем (цыкл вершаў «Вайна 1914–1917», шэраг апавяданняў, аповесць «Набліжэнне»), А. Гаруном (вершы «Праводзіны», «Чалавечая кроў», «На варце»), нават маладым М. Багдановічам (рускамоўная мініяцюра «Страшнае»). Аднак першынства і глыбіня асэнсавання Першай сусветнай вайны, бясспрэчна, належыць М. Гарэцкаму, які быў яе непасрэдным удзельнікам.

Вайна значна паўплывала на светапогляд М. Гарэцкага, а таксама на пераацэнку многіх жыццёвых каштоўнасцей, на разуменне чалавека і на яго ўзаемасувязі з жыццём, што, безумоўна, не магло не адбіцца на яго творчасці. Падчас Першай сусветнай вайны ён піша апавяданні «Генерал», «На этапе», «Літоўскі хутарок», «Рускі», у якіх гучыць непрыманне вайны, пратэст супраць яе. Больш яскрава тэма вайны раскрытая ў дакументальна-мастацкіх запісках «На імперыялістычнай вайне». Тут пісьменнік раскрыў антыгуманны характар вайны і паказаў, як правяраецца сутнасць чалавека ў складаных умовах. Увагу аўтар засяродзіў на праўдзівасці выяўлення сапраўднага твару вайны, яе супярэчнасці і шматбаковасці. Праз вобразы сялян, мяшчан і царскіх афіцэраў паказаны адносіны да вайны розных сацыяльных груп. Пытанні, узнятыя ў «запісках» М. Гарэцкага, агульначалавечыя, і для новых пакаленняў чытачоў твор мастака будзе невычэрпнай крыніцай спасціжэння чалавека і яго духоўных магчымасцей. Яму даводзілася тварыць, не абапіраючыся на мастацкі вопыт, бо ў набытках беларускай прозы таго часу твораў пра вайну зусім не было. М. Гарэцкага па праву лічаць прадстаўніком літаратуры «страчанага пакалення», бо тыя творы, якія ён пакінуў пасля сябе, не выдумка пісьменніка, а сапраўдныя гісторыі, заснаваныя на жыццёвым досведзе.

Вайна – гэта не толькі жах і трагедыя, але і выпрабаванне на чалавечнасць. Таму тэма чалавека і вайны закранае праблемы, якія хвалююць чалавецтва і сёння.

***О. А. Бурьяк***
*Науч. рук.* ***А. Ф. Берёзко,***
*канд. филол. наук, доцент*

## ПРОБЛЕМА МОРАЛЬНОГО ВЫБОРА В РАССКАЗЕ В. РАСПУТИНА «УРОКИ ФРАНЦУЗСКОГО»

Проблема морального выбора – одна из вечных тем в произведениях русской и мировой литературы. И чем сложнее выбор, тем больший след оставляет такое произведение в сердцах читателей. В рассказе В. Распутина «Уроки французского» показан моральный выбор юного героя: играть, чтобы сохранить жизнь и учиться, или уехать в родную деревню и забыть о продолжении учебы. Мальчик может вернуться в родную деревню, но по собственной воле остается, как бы морально трудно и тяжело ему ни было. Через внутренние монологи, его переживания и поступки в рассказе раскрываются мотивы такого выбора, который помогает герою одержать победу собственных моральных законов над несправедливостью, одиночеством, голодом, тоске по дому и родным. Выбор сделан, и мальчик вынужден самостоятельно спасаться от голода, угрожающего его жизни. Выход находится в лице Федьки, приведшего героя рассказа в компанию, играющую на деньги. Но тут мальчишка сталкивается с новыми испытаниями своего характера. Мальчик честен и наивен. Для главного героя игра – это игра в «расчетливость», которая может ему продлить жизнь. С этой стороны, его выбор можно понять и принять, и у вдумчивого читателя он не вызывает отторжения, чего не скажешь о других его сверстниках-игроках. Для Вадика игра – это способ стать выше других, показать свою значимость, получить влияние на других мальчишек. Птаха не делает над собой каких-либо моральных усилий. Зачем? Ему удобно за спиной Вадика. За него подумают и решат другие – типичный приспособленец. Изгнание героя рассказа из команды игроков и последующие избиения – действие, вызванное страхом Вадика перед более умным и твердым соперником утратить свой авторитет и влияние. Поэтому для нас приход в игру главного героя воспринимается положительно, так как это способ выжить,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ